# *§ 13–0. Прамысловы пераварот у Расійскай імперыі

ПРАМЫСЛОВЫ ПЕРАВАРОТ
КАПІТАЛІЗМ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ
ФАБРЫКА МАНУФАКТУРА
РАМЕСНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ
ПРАЛЕТАРЫЯТ БУРЖУАЗІЯ
ВЫТВОРЧАСЦЬ
ЭКСПАРТ ІМПАРТ

**Этапы прамысловага перавароту**

**1. Асноўныя этапы і асаблівасці.** У развіцці прамысловага перавароту ў Расіі выразна вылучаюцца тры этапы, шчыльна звязаныя з рэформамі, якія праводзіліся ў краіне:

| Канец 1830-х — сярэдзіна 1880-х гг. | Сярэдзіна 1880-х — 1890-я гг. | Канец XIX ст. — 1905 г. |
| --- | --- | --- |
| Зараджэнне і паступовае паўсюднае зацвярджэнне фабрычна-заводскай вытворчасці, а таксама стварэнне передумоў для дынамічнага індустрыяльнага развіцця. Адбывалася хуткая механізацыя тэкстыльнай прамысловасці, што было абумоўлена больш хуткім атрыманнем прыбытку менавіта ў гэтай галіне | Адбывалася карэнная рэканструкцыя прамысловай вытворчасці, якая суправаджалася бурным развіццём чыгуначнага будаўніцтва, ростам цяжкай прамысловасці і энергаёмістых вытворчасцей, развіццём інжынернай справы | Адбывалася стварэнне рабочых машын для вытворчасці іншых рабочых машын |

Асаблівасці прамысловавага перавароту

Прамысловы пераварот у Расіі пачаўся крыху пазней, чым у вядучых заходніх краінах, што было абумоўлена захаваннем прыгоннага права. Гэтая акалічнасць прывяла да запаволенага фарміравання пласта наёмных рабочых і ў цэлым дзвюх асноўных сацыяльных груп буржуазнага грамадства — буржуазіі і пралетарыяту. У адрозненне ад краін Захаду, у Расіі прамысловы пераварот пачаўся да правядзення буржуазных рэформаў. Але ў той жа час у Расіі маглі выкарыстоўваць заходні досвед і само прамысловае развіццё адбывалася пад уздзеяннем прамысловага перавароту, які ўжо адбыўся на Захадзе.

Успомніце, калі прамысловы пераварот пачаўся ў краінах Заходняй Еўропы.

Яшчэ адной асаблівасцю было больш маруднае, нават застойнае развіццё сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, у Расіі вельмі адчуваўся недахоп капіталаў для арганізацыі машыннай вытворчасці, у сувязі з чым былі неабходныя замежныя інвестыцыі. Між тым фінансавымі рэсурсамі валодала дзяржава, якой да таго ж патрабаваліся тэхнічныя інавацыі. Гэта прывяло да ўмяшання дзяржавы ў эканоміку.

Укараненне машын

**2. Змены ў прамысловасці.** З пачаткам прамысловага перавароту на фабрыках усё шырэй пачалі выкарыстоўвацца машыны, але іх укараненне тармазілася панаваннем прыгоннай працы: прыгонныя сяляне на памешчыцкіх і прыпісных мануфактурах часцяком ламалі новыя механізмы. У той жа час укараненне машын стымулявала рост колькасці задзейнічаных у вытворчасці вольнанаёмных рабочых.

Пераадоленне адставання ў прамысловасці

Да сярэдзіны стагоддзя выразна акрэслілася адставанне прыгонніцкай Расіі ад Еўропы, якая ў асноўным ліквідавала феадальныя перажыткі, у развіцці прамысловасці. Гэтая адсталасць расійскай прамысловасці найбольш відавочна праявілася падчас Крымскай вайны: у новых умовах сярэдзіны стагоддзя перамогу здабывалі дзяржавы, якія былі лепей падрыхтаваныя менавіта ў тэхнічных ад-

носінах. А змены ў прамысловасці былі магчымыя толькі пасля пераўтварэнняў у сацыяльнай галіне.

Адмена прыгоннага права дала выдатную магчымасць для імклівага развіцця капіталізму ў прамысловасці і такім чынам дазволіла скараціць адставанне ад вядучых заходнееўрапейскіх дзяржаў. Галоўнымі фактарамі, што спрыялі развіццю прамысловасці, былі з'яўленне значнай колькасці вольных сялян, якія ператвараліся ў наёмных рабочых, і ўкараненне ў вытворчасць машын. Гэтыя фактары былі ўзаемазвязаныя, таму што машыны патрабавалі пэўнай кваліфікацыі рабочага, яго зацікаўленасці ва ўдасканаленні вытворчых навыкаў, што было немагчыма ва ўмовах прымусовай працы.

Чаму адмена прыгоннага права паспрыяла з'яўленню значнай колькасці рабочых?

### Стадыі развіцця прамысловасці

У капіталістычным развіцці прамысловасці вылучаюць тры стадыі: дробная таварная вытворчасць — капіталістычная мануфактура — фабрыка (буйна́я машынная індустрыя). Усе гэтыя тры стадыі былі шчыльна звязаны адна з адной, і, як правіла, развіццё адбывалася ад ніжэйшай да вышэйшай.

На момант адмены прыгоннага права шэраг галін расійскай прамысловасці знаходзіўся на стадыі мануфактуры, але некаторыя перайшлі ўжо да выкарыстання паравых машын, г. зн. на фабрычную стадыю. На мануфактурнай стадыі і ў парэформенны перыяд заставаліся тыя прадпрыемствы, дзе было цяжка механізаваць работы або захоўваліся моцныя перажыткі прыгонніцтва.

### Рост прамысловай вытворчасці

Аднак у большасці галін буйной прамысловасці на 80-я гг. XIX ст. быў завершаны прамысловы пераварот. Гэта прывяло да значнага росту паказчыкаў узроўню вытворчасці, нават на міжнародным фоне. З 1861 да 1879 г. колькасць машынабудаўнічых заводаў вырасла з 99 да 187. Але самымі хуткімі тэмпамі развіваліся новыя галіны — здабыча вугалю і нафты. У цэлым паводле тэмпаў развіцця цяжкай прамысловасці Расія выйшла на

першае месца ў свеце. Гэтаму спрыяла тая акалічнасць, што Расія магла выкарыстоўваць досвед і дасягненні перадавых краін Захаду, якія раней сталі на шлях капіталістычнага развіцця; існавала таксама магчымасць выкарыстоўваць замежныя капіталы, тэхніку, тэхнічны персанал.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**Доля краін у сусветнай прамысловай вытворчасці (%)**




1. *Вывучыце прапанаваную дыяграму. Якія дзяржавы павялічылі, а якія паменшылі сваю долю ў сусветнай прамысловай вытворчасці?*
2. *Параўнайце паказчыкі Расіі і вядучых краін свету. Зрабіце вывады.*
3. *Вызначце фактары, якія дазволілі Расіі павялічыць сваю долю ў сусветнай прамысловай вытворчасці.*

**3. Вынікі прамысловага перавароту.** Да ліку найважнейшых вынікаў прамысловага перавароту ў Расіі належалі:

Вынікі прамысловага перавароту

— з'яўленне і развіццё новых галін прамысловасці — хімічнай, машынабудаўнічай і інш.;
— фарміраванне новых сацыяльных груп (класаў), трансфармацыя расійскага саслоўнага грамадства;
— уключэнне ў новы пласт буржуазіі купцоў, чыноўнікаў, сялян і дваран;
— фарміраванне за кошт сялянства рабочага класа (наёмных рабочых);
— значны рост прамысловай вытворчасці;
— стварэнне больш эфектыўнай вытворчасці і тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў.

Вытворчасць вугалю і сталі

Тэмпы росту некаторых галін расійскай прамысловасці да канца XIX ст. уражвалі. Расія ператварылася ў вядучую краіну па вытворчасці сталі і вугалю, а яе доля ў сусветнай вытворчасці дасягнула 2,6 %. У той жа час для Расіі экспарт вугалю і металаў зрабіўся асноўнай крыніцай даходаў. Расійскія тавары на роўных спаборнічалі з заходнімі аналагамі, што, у сваю чаргу, спрыяла эканамічнаму росту.

Прыцягненне замежнага капіталу

Для парэформеннага перыяду характэрнае таксама ўзмоцненае прыцягненне замежнага капіталу, чаму спрыялі танная рабочая сіла, багатыя радовішчы карысных выкапняў, пастаяннае павышэнне мытаў на ўвоз тавараў. Пры гэтым асноўнай сферай прыцягнення замежнага капіталу была горная, машынабудаўнічая, хімічная галіны прамысловасці, тады як айчынны капітал імкнуўся галоўным чынам у лёгкую прамысловасць, дзе прыбытак быў вышэйшы. У асноўным капіталы ўвозіліся з Францыі, Англіі, Бельгіі і Германіі.

**Тэрытарыяльнае пашырэнне капіталізму**

Адметным для Расіі было таксама развіццё капіталізму ўшыркі, якое дазваляла ўцягваць у агульнарасійскі працэс далёка раскіданыя і адсталыя ўскраіны. Але ў цэлым развіццё ўшыркі перашкаджала развіццю капіталізму ўглыб, г. зн. інтэнсіфікацыі і ўдасканаленню вытворчасці ў цэнтры краіны. Прамыслоўцы не бачылі ў гэтым неабходнасці, зыходзячы з таго, што нават прадукцыя невысокага гатунку заўсёды знойдзе попыт на ўскраінах.

**4. Расійская імперыя ў сусветнай эканоміцы.** Пасля адмены прыгоннага права ў Расіі адбываецца яе імклівае ўключэнне ў сусветную эканоміку. Менш чым за 40 гадоў у 4 разы вырасла абарачэнне знешняга гандлю Расіі. Вывозілі галоўным чынам хлеб. Нават нягледзячы на падзенне цэн у 1871–1895 гг., агульны кошт хлеба, які вывозіўся, няўхільна павышаўся. Адбылося гэта ў выніку павелічэння долі ў экспарце даражэйшай пшаніцы і скарачэння вывазу жыта, мукі і круп.

**Экспарт**

У першыя парэформенныя гады на другім месцы пасля хлеба ў экспарце ішла воўна, пасля лён, алейнае насенне, сала, пянька. На сярэдзіну 1890-х гг. хлеб заставаўся на першым месцы, але на другое месца выйшаў лес. У 3 разы вырас вываз ільну, ён заняў трэцяе месца ў агульным экспарце; узрасла таксама доля яек, масла. Прамысловыя тавары па-ранейшаму займалі нязначнае месца ў расійскім экспарце. Галоўнымі сярод іх былі цукар, баваўняныя тканіны, нафта, газа.

**Імпарт**

Напачатку парэформеннага перыяду ў імпарце першае месца займала бавоўна-сырэц, пасля ішлі чай, фарбавальныя рэчывы, тканіны, машыны, віны. Напрыканцы стагоддзя на першае месца ў імпарце выйшлі машыны. Значную долю імпарту па-ранейшаму складала бавоўна, бо баваўняная прамысловасць не паспявала за ростам бавоўнаводства ў Сярэдняй Азіі і Закаўказзі. Увозіліся ў Расію ў канцы стагоддзя таксама металы, вугаль, чай, нафта.

**Галоўныя гандлёвыя партнёры Расіі напрыканцы XIX ст.**

| Экспарт | Імпарт |
|---|---|
| 1. Германія | 1. Германія |
| 2. Англія | 2. Англія |
| 3. Галандыя | 3. ЗША |
| 4. Францыя | 4. Кітай |
| 5. Італія | 5. Францыя |

Растлумачце, чаму ў канцы XIX ст. галоўнымі гандлёвымі партнёрамі Расіі былі краіны Заходняй Еўропы.

**Суадносіны экспарту і імпарту**

У 60-х гг. XIX ст. Расія вывозіла і ўвозіла тавараў прыкладна на аднолькавую суму; напачатку 70-х гг. XIX ст. баланс пасунуўся не на карысць Расіі, але ў 80-х — пачатку 90-х гг. XIX ст. вываз перавышаў увоз на 150–230 млн руб. штогод, што дазваляла назапашваць у краіне золата для правядзення грашовай рэформы.

У цэлым развіццё знешняга гандлю дазваляе зрабіць вывад аб тым, што і напрыканцы стагоддзя Расія заставалася аграрнай краінай, але відавочны і рост прамысловасці.

*Прамысловы пераварот пачаўся ў Расіі пазней, чым у краінах Заходняй Еўропы. Перажыткі феадальных адносін і прыгонніцтва стрымлівалі прамысловае развіццё ў першай палове XIX ст. Пасля адмены прыгоннага права прамысловы пераварот ажыццяўляўся больш хуткімі тэмпамі. Гэта спрыяла ўключэнню Расіі ў сусветную эканоміку, што знаходзіла адлюстраванне перш за ўсё ў імклівым росце таваразабмену.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
| --- | --- |
| 1801 г. — заснаваны Санкт-Пецярбургскі чыгуналіцейны завод | 1820-я гг. — будаўніцтва першых фабрык на тэрыторыі Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Вылучыце асноўныя этапы прамысловай рэвалюцыі ў Расійскай імперыі. Вызначце іх асаблівасці.
2. Якія змены адбыліся ў развіцці прамысловасці Расійскай імперыі пад уплывам прамысловай рэвалюцыі?
3. Вызначце эканамічныя і сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі.
4. Ахарактарызуйце ролю Расіі ў сусветнай эканоміцы. Вызначце структуру яе імпарту і экспарту. Назавіце галоўных гандлёвых партнёраў Расійскай імперыі.